**ЛИТЕРАТУРА**

1. Гардзіенка, Н. Беларусы ў Аўстраліі, да гісторыі дыяспары / Н. Гардзіенка. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 468 с.
2. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 1. А – Л. – 736 с.
3. Личность, культура, этнос: современная психологическая антропология / под общ. ред. А. А. Белика. – М. : Смысл, 2001. – 555 с.
4. Архив Института искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы Национальной академии наук Беларуси. – Ф. 23. Оп. 17. Д. 2.

РЕЗЮМЕ

В статье рассмотрены основные причины переселения белорусов в Эстонию. Главный акцент сделан на анализе обрядов «Коляды» и «Пасха», выявлены их особенности, рассмотрена региональная специфика, а также символика в обрядовой поэзии.

SUMMARY

The article is devoted to significant reasons for the resettlement of Belarusians to Estonia. The main focus is on the analysis of the rituals «Kolyady» and «Easter», their peculiarities are revealed, regional specificity is examined, and symbolism in ritual poetry is analyzed.

***Рабец Т. Д.***

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СУЧАСНЫХ ЖАНРАЎ БЕЛАРУСКАГА ГАРАДСКОГА ФАЛЬКЛОРУ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*
*(Паступіў у рэдакцыю 15.03.2018)*

Для беларускай фалькларыстыкі, якая з самага пачатку свайго існавання займалася вывучэннем толькі класічных форм фальклору сялянскага насельніцтва і менавіта на матэрыяле традыцыйнага фальклору выпрацавала ўвесь тэарэтычны і аналітычны інструментарый фалькларыстычнай навукі, вывучэнне сучаснага гарадскога фальклору на сённяшнні дзень становіцца вельмі актуальнай задачай. Кола пытанняў, якое патрабуе свайго вырашэння, вельмі шырокае: гэта і апісанне сучаснага стану як традыцыйных жанраў, так і новых твораў гарадскога фальклору, і вырашэнне праблем узаемаадносін кніжнай і вуснай традыцый, і тлумачэнне працэсаў фалькларызацыі. Важным таксама становіцца тое, што розныя сферы бытавання сучаснага фальклору трэба разглядаць у цеснай узаемасувязі, у арганічным адзінстве. Пры гэтым неабходна ўлічваць і хранатоп, і лакальна-этнічныя асаблівасці традыцый, і сучасны гісторыка-сацыяльны кантэкст.

Паступовае ўвядзенне ў навуковы ўжытак шырокага пласта «некласічных», «маргінальных» фальклорных матэрыялаў выклікала дысцыплінарны крызіс у фалькларыстыцы, праблематызаваўшы практычна ўсе яе асноватворныя тэрміны, уключаючы цэнтральныя з іх – «фальклор», «вуснае», «народнае», «безаўтарства», «паўтаральнасць», «варыятыўнасць», якія не заўсёды адпавядаюць спецыфіцы гарадскога фальклору. Таму перад навукоўцамі ў цяперашні час паўстала вострая неабходнасць удакладнення

прадмета, прынцыпаў, катэгорый і метадаў даследавання. Разам з тым пры звароце да гарадскога фальклору неабходна карэктаваць не толькі метадалогію даследавання, але і прынцыпы збіральніцкай дзейнасці, якія склаліся ў практыцы вывучэння традыцыйных жанраў фальклору. Так, шматлікія жанры гарадскога фальклору распаўсюджваюцца як у пісьмовай, так і вуснай форме, прычым абодва каналы камунікацыі цесна пераплеценыя. Аднак класічная фалькларыстыка патрабуе запісваць толькі вусныя творы. Акрамя таго, развіццё тэлекамунікацыйных тэхналогій абумовіла станаўленне новага спосабу існавання фальклору – сеткавага. Звяртаючыся да фальклорных матэрыялаў, якія функцыянуюць у Інтэрнэце, мы маем справу не з дэградацыяй фальклору і не з асобным яго тыпамі, а са спецыфічным сеткавым спосабам бытавання фальклору.

Запісваць тэксты гарадскога фальклору вельмі праблематычна. Шматлікія яго жанры нярэдка цяжка заўважыць, а вымаўленне некаторых тэкстаў яшчэ і складана справакаваць. Часцей за ўсё фальклорныя тэксты запісваюцца ў сітуацыі «ўключанага назірання», дзякуючы чаму яны фіксуюцца ў натуральных умовах і справакаваны толькі зацікаўленасцю ў гутарцы збіральніка, а не пытаннямі анкеты. Аднак у сітуацыі гутаркі, а не адмыслова арганізаванага інтэрв'ю не заўсёды магчыма ўжыванне дыктафона, у сувязі з чым частка тэкстаў запісваецца па памяці, а значыць, могуць быць прапушчаны як фанетычныя характарыстыкі, так і пазначэнні рытмічных перыядаў гутаркі, асобныя ўступныя словы, неабходныя для аналізу ілакутыўных установак тэксту. Пры гэтым павінен запісвацца кантэкст гутаркі, полаўзроставыя і статусныя характарыстыкі суразмоўцаў, што таксама не заўсёды магчыма здзейсніць.

У працэсе фарміравання гарадскога фальклору вылучаецца два процілеглыя накірункі. Першы характарызуецца тэндэнцыяй да ўзнікнення «закрытых» традыцый, якія нараджаюцца пад уплывам імкнення членаў грамадства, з аднаго боку, да ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі, а з другога – да культурнай ізаляцыі. Гэта прыводзіць да стварэння спецыфічных культурных кодаў і тэкстаў, што функцыянуюць толькі ўнутры такіх закрытых супольнасцяў. Да іх ліку адносяцца некаторыя аматарскія і прафесійныя аб'яднанні (напрыклад, футбольных балельшчыкаў, турыстаў, пажарных, праграмістаў і г. д.), нефармальныя групы моладзі, канфесійныя групы, крымінальныя кланы і іншыя. Можна заўважыць, што вялікая частка такіх аб'яднанняў носіць пераважна або выключна часовы характар. Да іх ліку адносяцца субкультуры войска, турмы, бальніцы, дзіцячага лагера і г. д.

Другі накірунак звязаны з абменам фальклорным рэпертуарам розных сацыяльных груп, цыркуляцыяй вусных твораў за межамі асяроддзя, дзе яны нарадзіліся, што абумоўлена іх высокай сацыяльнай мабільнасцю і значным уплывам сродкаў масавай інфармацыі на распаўсюджванне фальклору сярод гарадскога насельніцтва. Прыкладам такіх твораў з'яўляюцца «блатныя» песні, якія выконваюцца сярод людзей, што не адносяцца да сацыяльнай групы дадзенага тыпу.

Бытаванне гарадскога фальклору выклікала з’яўленне новых жанравых асаблівасцей, не характэрных для традыцыйнага фальклору. Так, з аднаго боку, гарадскі фальклор становіцца поліцэнтрычным і фрагментаваным, што звязана з сацыяльным, прафесійным, узроставым, кланавым расслаеннем насельніцтва горада, яго распадам на слаба звязаныя паміж сабой ячэйкі, якія не маюць агульнай светапогляднай асновы. З другога боку, сучасны гарадскі фальклор – з’ява сінкрэтычная. Ён не існуе ў выглядзе «чыстага» рэпертуару фальклорных твораў або абрадавых дзеянняў і рытуалаў. Так, народная паэзія становіцца неаддзельнай ад рукапісных зборнікаў і нярэдка звязана з пэўнымі абрадамі, якія праводзяцца прадстаўнікамі розных сацыяльных груп (напрыклад, у салдат, альпіністаў, зняволеных, падлеткаў і г. д.). Пры гэтым вербальныя формы нароўні з невербальнымі (акцыянальнымі і атрыбутыўнымі) элементамі культуры фальклору займаюць пераважнае становішча.

Важнай сацыякультурнай рысай сучаснага гарадскога фальклору з’яўляецца мова бытавання твораў. Агульная сітуацыя ў краіне такая, што ў гарадскіх умовах руская мова пераважае над беларускай. Выкарыстанне рускай мовы ў прававой, адукацыйнай, палітычнай, грамадскай і іншых сферах жыцця ўсеагульнае. Таму, адпаведна, і фальклорныя творы ў гарадскім асяроддзі, як правіла, бытуюць у рускамоўной форме.

Гарадскі фальклор прадстаўлены шырокім спектрам жанраў, сярод якіх выяўляюцца як творы традыцыйнага фальклору, так і тэксты больш позняга паходжання. Непасрэдная пераемнасць гарадскога фальклору ад традыцыйнага даволі праблематычная, а ў некаторых выпадках і зусім немагчымая. У большасці выпадкаў многія тэматычныя і стылістычныя супадзенні тлумачацца не прамой роднасцю, а канвергентным набыццём падобных прыкмет або рэпрэзентацыяй архетыпаў і ўніверсалій грамадскай свядомасці.

У сувязі з тым, што гарадскі фальклор – гэта з’ява, з аднаго боку, шматгранная, прадстаўленая вялікай колькасцю жанраў, а з другога – фальклор увесь час актыўна развіваецца і хутка трансфармуецца, класіфікаваць яго жанры можна толькі прыблізна. У першую чаргу сучасны гарадскі фальклор можна падзяліць па форме існавання на дзве групы: вусны і пісьмовы.

Да пісьмовых форм адносяцца рукапісныя і друкаваныя спеўнікі, альбомныя вершы, вершаваныя подпісы да фатаграфій, паштовак, лістоў і г. д., графіці, «магічныя лісты» («святыя лісты», «лісты шчасця» і іншыя віды лістоў), аўдыё- і відэазапісы і іншыя.

Сярод вусных форм гарадскога фальклору вылучаюць:

1) гарадскі абрадавы фальклор;
2) гарадская фальклорная проза;
3) малыя жанры гарадскога фальклору;
4) гарадская фальклорная паэзія;
5) гарадскі дзіцячы фальклор;

6) фальклор гарадскіх субкультур;

7) «інтэлігентны» фальклор.

У вусным рэпертуары фіксуюцца як творы традыцыйных жанраў вуснай народнай творчасці (каляндарна-абрадавыя і лірычныя песні, калыханкі, забаўлянкі, заклічкі, анекдоты і г. д.), так і тэксты пазнейшага паходжання – постфальклору (страшылкі, «садысцкія вершы», пераробкі-пародыі і інш.). Аднак ступень распаўсюджанасці таго або іншага жанру розная.

Вялікую цікавасць выклікае пытанне ступені захаванасці і форм існавання паэзіі каляндарных традыцый гарадскіх жыхароў. Гарадскі абрадавы фальклор дзеліцца на два комплексы:

1) сфера грамадскага побыту, якая ўключае ў сябе паэзію абноўленых каляндарных традыцый і сучасных свят, выпускных вечароў, вечароў сустрэч, «пасвячальных» абрадаў (у салдатаў тэрміновай службы, студэнтаў, крымінальнікаў, альпіністаў, турыстаў і г. д.);

2) сфера хатняга побыту, прадстаўленая рэпертуарам сучаснага застолля, вяселля, хрэсьбін, пахаванняў, провадаў у войска і г. д.

Як паказваюць назіранні, сучасны стан класічнага фальклору дэманструе агульную тэндэнцыю паступовага згасання народнай традыцыі, прыўнясенне ў яе новых, не характэрных для традыцыйнага ўкладу жыцця беларускага народа элементаў. Аднак традыцыйны фальклор не зусім знік, а, функцыянуючы спарадычна, працягвае захоўвацца ў пасіўнай памяці народа. Нягледзячы на ўяўную прастату, збіраць каляндарна-абрадавы фальклор у гарадскіх умовах даволі праблематычна. З аднаго боку, каляндарны і сямейны фальклор існуе ў жывым бытаванні нават тады, калі самі народныя абрады ўжо не праводзяцца. Звычайна інфарманты з задавальненнем апавядаюць пра зімовыя, вясновыя, летнія, восеньскія святы, пра радзільныя, вясельныя і пахавальныя абрады і звычаі, асабліва калі самі ўдзельнічалі ў іх, назіралі або толькі чулі ад іншых. З другога боку, фальклорны матэрыял падаецца са спасылкай на сельскую мясцовасць, адкуль родам або сам выканаўца, або яго блізкія, і не мае адносін да фальклору сучаснага горада, што, безумоўна, абцяжарвае вырашэнне задачы правамернасці адносіць падобныя творы да гарадскога абрадавага фальклору. Такім чынам, можна казаць пра тое, что каляндарна-абрадавая паэзія, запісаная ў апошнія дзесяцігоддзі, пераважна прадстаўлена ў другаснай форме існавання, калі шматлікія яе жанры, асабліва абрадавай сферы, або спынілі сваё жывое бытаванне і могуць узнаўляцца штучна, або, працягваючы бытаваць у народным асяроддзі, змянілі функцыянальнасць і форму бытавання.

Акрамя таго, паслабленне фактару залежнасці чалавека ад прыродных умоў прывяло да дэсемантызацыі і дэрытуалізацыі традыцыйнага каляндарна-абрадавага фальклору, яго пераходу ў «цырыманіяльную» форму, перавагі вербальных складнікаў абраду над невербальнымі, зруху тэрмінаў правядзення свят і г. д. Змена характару каляндарнай абраднасці прывяла да скарачэння пэўных фрагментаў абраду, змены полаўзроставай структуры ўдзельнікаў, абрадавай атрыбутыкі і рэквізіту, гукавога фону, часавай і

прасторавай прымеркаванасці, сцэнарыя і г. д. Супастаўляючы традыцыйную і сучасную мадэлі каляндарных свят, можна таксама заўважыць працэс дэсакралізацыі і ператварэння свят у масавае забаўляльнае відовішча. Істотна трансфармавалася і сімвалічная сутнасць рытуалу: замест выразнай аграрнай скіраванасці абрадаў на першае месца выступае асабістая матывацыя ўдзельнікаў ў каляндарным абрадзе, гэта значыць «для сябе», дзеля ўласнай забаўкі або асабістых патрэб. Найбольшае разбурэнне адчуў на сабе музычна-абрадавы фальклор, у той час як вусная інфармацыя пра абрады даволі добра захавалася ў памяці старэйшага пакалення, некаторыя абрадавыя дзеянні выконваюцца і сёння (напрыклад, упрыгожванне хат зелянінай на Сёмуху, правядзенне памінальных абрадаў (Дзядоў), асвячэнне вярбы на Вербніцу, фарбаванне яйкаў на Вялікдзень, Радаўніцу і Сёмуху, асвячэнне яблыкаў, мёду і маку на Спасы і г. д.).

У цяперашні час каляндарная сістэма Беларусі ўяўляе сабой сінтэз нацыянальных святочных традыцый, прыродна-гаспадарчых і хрысціянскіх календароў, дзяржаўных і прафесійных свят. Для сучаснага беларуса аднолькава важна адзначаць такія святы, як Каляды і Новы год, Вялікдзень і 8 Сакавіка, Спас і Дажынкі, Дзень святога Георгія (Юр’еў дзень) і 1 Мая і г. д. Аднак пры ўсёй значнасці і раўнацэннасці ўсіх складнікаў сучаснага беларускага календара назіраецца перавага менавіта ў бок хрысціянскіх свят. У выніку складанага спалучэння, узаемадзеяння, узаемапранікнення дзвюх сістэм светапогляду – дахрысціянскай і хрысціянскай – у сучаснай Беларусі функцыянуе народны каляндар свят і абрадаў, часавая прымеркаванасць якіх вызначаецца царкоўна-хрысціянскім календаром. Акрамя таго, каляндарная абраднасць Беларусі ўключае ў сябе сістэму агульных для ўсёй краіны гадавых каляндарных свят, а таксама сістэму «мясцовых» свят, якія адзначаюцца толькі ў асобных населеных пунктах.

Другую па значнасці групу вуснага фальклору складае гарадская проза, што існуе ў велізарнай колькасці форм: бывальшчыны (апавяданні пра даўнія падзеі); дэманалагічныя былічкі; мемараты (апавяданні сведкаў пра нядаўнія падзеі); тапанімічныя і гістарычныя паданні; гарадскія і сямейныя легенды; міфы; чуткі, плёткі; байкі, анекдоты; апавяданні пра анамальныя з’явы, выпадкі з жыцця і іншыя. Кожная з форм гарадской прозы ўтрымлівае як наратыўныя (якія апавядаюць), так і дыскурсіўныя (з’яўляюцца часткай маўленчага дыскурсу) тэксты. Пры гэтым у гутарковым дыскурсе апавядальнік сам адносіцца да таго рэальнага свету, пра які расказвае, у той час як аўтар наратыўнага тэксту знаходзіцца па-за межамі створанага ім тэксту. Працэнт дыскурсіўнасці тэкстаў узрастае па меры руху ад апавяданняў пра тое, «што было», да падзей, якія нібы адбываліся сёння, гэта значыць чутак і прагнозаў. Таму збіральніку гарадской фальклорнай прозы складана зафіксаваць такі тэкст і, тым больш, класіфікаваць яго паводле прынятай тэарэтычнай схемы.

Малыя жанры гарадскога фальклору па-ранейшаму працягваюць актыўна бытаваць і развівацца. Пры гэтым сучасныя ўстойлівыя выражэнні, з аднаго боку, захоўваюць міфалагічныя ўяўленні, а з другога – уводзяць ў сваю традыцыйную

структуру новыя элементы, вобразы і сюжэты. Так, спецыфіка вобразна-структурнай будовы афарыстычных выразаў, іх сцісласць і трапнасць ў апісанні характэрных якасцей садзейнічае абагульненай форме перадачы асноўнай думкі выказанага меркавання. Прыказкі і прымаўкі, якія ўзыходзяць сваімі каранямі да глыбокай старажытнасці, па-ранейшаму нясуць ў сабе мастацкі патэнцыял і акумулююць веды пра навакольны свет і месца ў ім чалавека. Парэміі складаюць своеасаблівы збор маральных абагульненняў і ацэнак. У загадках адлюстроўваюцца асаблівасці народнага побыту і спецыфіка народнага мыслення. Пастаяннае ўзбагачэнне жанравай палітры ўласціва дабразычанням, што гучаць на сямейных урачыстасцях, грамадскіх святах. Дабразычанні перажываюць своеасаблівае адраджэнне, абумоўленае патрэбамі сучаснасці, новымі духоўнымі запытамі носьбітаў фальклору. У іх не фіксуюцца асобныя падзеі і рэаліі жыцця, а абагульняюцца тыповыя сітуацыі ў жыцці людзей. Яны адлюстроўваюць дынаміку развіцця этычных і эстэтычных поглядаў іх стваральнікаў.

Гарадская фальклорная паэзія прадстаўлена рознымі па форме і змесце песнямі: прыпеўкамі, песеннымі пераробкамі, рамансамі, побытавымі, палітычнымі песнямі, песнямі-пародыямі, фалькларызаванымі формамі эстраднай і аўтарскай (бардаўскай) песні і іншымі. Найбольш часта ў гарадскім асяроддзі можна пачуць побытавыя песні, сярод якіх асабліва вылучаюцца любоўныя і сямейныя. Іх вызначальная рыса – адмысловая прэзентацыя любоўных і сямейных канфліктаў, акцэнт на думках і пачуццях герояў, звязаных з пэўнай жыццёвай сітуацыяй. Асноўная тэма любоўных песень – каханне (шчаслівае, няшчаснае, ідэальнае і г. д.).

Па-ранейшаму ў гарадскім асяроддзі не страцілі сваёй актуальнасці жартоўныя песні і прыпеўкі. Існаванне ў кантэксце гарадской фальклорнай паэзіі жартоўных песень абумоўлена іх асаблівасцямі. У першую чаргу яны прызначаны ствараць пэўны настрой, захапляць слухачоў, павесяліць іх. Асноўная тэматыка гэтых твораў – сямейна-побытавыя адносіны паміж традыцыйнымі персанажамі: мужам і жонкай, дзедам і бабай, зяцем і цешчай, нявесткай і свекрывёй, хлопцам і дзяўчынай.

Не меншую цікавасць выклікаюць так званыя «песні-пераробкі», пад якімі найчасцей разумеюць фальклорныя творы, што ўзніклі на аснове іншага твора – фальклорнага ці літаратурнага, але істотна перапрацаваныя ў адпаведнасці з актуальнымі побытавымі, сацыяльнымі, гістарычнымі, палітычнымі момантамі.

З рэпертуару гарадскога дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі і пястушкі, недарэчнасці, нескладухі, лічылкі і гульнявыя прымаўкі, цвялілкі (мянушкі, абзыванні), загадкі-жарты, «садысцкія вершыкі», «страшылкі» і анты-«страшылкі», «выкліканні», парадыйная паэзія школьнікаў, школьны тлумачальны слоўнік, анекдоты і інш.) найвялікую жыццяздольнасць паказалі калыханкі, пацешкі і пястушкі. Нягледзячы на тое, што існуюць розныя спосабы заспакаення дзяцей, многія бацькі ў сітуацыі, калі ім трэба класці дзіця спаць, звяртаюцца да гайдання і напявання якіх-небудзь тэкстаў. Рэпертуар выкананых песень злучаны з асабістым вопытам выканаўцы. Сучасныя бацькі спяваюць тое, што было пачута ў дзяцінстве, фальклорныя калыханкі, знаёмыя па дзіцячых

выданнях, папулярныя шлягеры ці песні вайсковых гадоў, засвоеныя ў школьныя гады і іншае. Передачы з пакалення ў пакаленне падлягаюць не толькі самі тэксты, але і рытміка, эмоцыі і інтанацыі, важныя як для дзіцяці, так і для дарослага.

Фальклор гарадскіх субкультур – гэта даволі вялікі фрагмент агульнагарадской культуры, які раней не заўважалі з прычыны або яго табуяванасці, або, наадварот, штодзённасці. Сваё пашырэнне тэрмін «субкультура» атрымаў у 2-й палове ХХ ст. у заходнееўрапейскай навуцы ў кантэксце вывучэння моладзевых рухаў. Спачатку ў дадзеным тэрміне на першым плане знаходзілася прыстаўка «суб-» («пад-»), якая акцэнтавала ўвагу на ўтоеных, неафіцыйных пластах агульнапрынятай культуры.

Фальклор гарадскіх субкультур пададзены пераважна новымі жанрамі: моладзевы фальклор («сцёб», кіч), студэнцкі (афарызмы, выслоўі, прыказкі-пераробкі, «малітвы», загадкі, песні, анекдоты, байкі, вершы, недарэчнасці і інш.), вайсковы (павер'і, тосты, «маразмы», песні, непрыстойная паэзія і інш.), блатны (афарызмы, прыказкі, клятвы, праклёны, бажба, лаянка, песні, прыпеўкі, вершы, парнаграфічныя апавяданні, арыштанцкія гульні і інш.), прафесійны (пажарнікі, працоўныя, медыкі, альпіністы, турысты і г. д.), камп'ютарны, фанацкі і іншы. У цяперашні час у навуковай літаратуры даволі добра апісаны фальклор камп'ютарнай, блатной (крымінальнай), медыцынскай (бальнічнай), экстрэмальнай (альпіністаў, спелеолагаў, пажарных), спартыўнай субгруп.

Такім чынам, аналіз нават невялікай колькасці жанраў гарадскога фальклору паказвае, што сучаснае бытаванне фальклору – гэта вельмі складаны працэс безупыннага руху, эвалюцыі, змянення яго жанравага складу. Таму для стварэння цэласнай карціны гарадскога фальклору на сучасным этапе неабходна праводзіць усебаковае дэталёвае вывучэнне спецыфікі функцыянавання кожнага асобна ўзятага жанру. А для дасягнення гэтай мэты ў першую чаргу неабходна працягваць удасканальваць методыку збіральніцкай і даследчыцкай дзейнасці.

РЕЗЮМЕ

Статья посвящена описанию жанрового состава современного белорусского городского фольклора. Выявляется общая специфика современного городского фольклора, предлагается классификация жанров, определяется степень их сохранности.

SUMMARY

The article describes the structure of the modern genre of Belarusian urban folklore. The general specificity of modern urban folklore is revealed, a classification of genres of urban folklore is proposed, the degree of preservation of its individual types and genres is determined.